5 (106)
май

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 411 ад
28 чэрвеня 1996 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі,
Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускае таварыства «Веды»**

***Рэдакцыйная калегія:***

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

**Сымон Барыс** (рэдактар аддзела),**Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч** (намеснік галоўнага рэдактара), **Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер** (рэдактар аддзела), **Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часнoўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***

**Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Міранoвіч, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцева, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.**

## ЗМЕСТ

### УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Алена Александровіч — Беларуска-казахстанскія ўзаемасувязі ў 1991—2006 гг. — 3

### ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

Сяргей Елізараў — Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР у 1965—1991 гг. — 11

### ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Валянціна Кузьміч — Барацьба з нелегальнымі ўзброенымі фарміраваннямі на беларускім участку савецка-польскага памежжа (1921—1926 гг.) — 18

### ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Зоя Лысенка — Першае пакаленне беларускіх майстроў оперы і балета — 27

**ГІСТОРЫЯ ПОШТЫ**

Павел Замара — Паштовая сістэма на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII—пачатак XX ст.) 37

Галіна Камандышка, Дзмітрый Станкевіч — Гісторыя Магілёўскай пошты ў XVII—XIX стст. 45

**ГІСТОРЫЯ І КАМП'ЮТЭР**

Вячаслаў Лазіцкі — Электронныя сродкі навучання як кампанент вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі Беларусі ў старшых класах 54

**МЕТОДЫКА. ВОПЫТ**

Ірына Кузьмянкова — Гарады Заходняй Еўропы ў Высокім сярэдневякоўі *(VI клас)* 61

Валерый Варганаў — Полацкая зямля ў IX—XII стст. Славутыя асобы Полацкай зямлі *(VI, X класы)* 65

Алена Палейка — "Справа Святаполка Акаяннага" (гістарычны дэтэктыў) *Урок-гульня (X клас)* 71

**КРАЯЗНАЎСТВА**

Іван Ліхараў — З вопыту складання зборніка матэрыялаў па гісторыі Рагачоўскага краю 76

Содержание 79

Summary 80


*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 04.07.2005 г. № 101 «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, педагагічных, філасофскіх і юрыдычных навуках, а таксама ў адпаведнасці з загадам ад 05.10.2005 г. № 143 — па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*


*Адрас рэдакцыі: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакой 402; 220050, Мінск, вул. Ленінградская, 14, пакой 707. Тэлефоны: (017) 284-27-00, 209-54-63; факс: 284-27-00.*
http://aiv.by; e-mail: aiv@aiv.by, bhc@aiv.by.



**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**
Падпісана да друку 14.05.2008 г.
Выхад у свет 26.05.2008 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 1/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.
Наклад 1682 асобнікі. Зак. 0803.
*Надрукавана ў друкарні РУП «Прамдрук».*
*Ліцэнзія № 02330/0148775 ад 30.04.2004 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


**Да ведама аўтараў!**
За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экземплярах (пажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), дакладны адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэмы.


© «Беларускі гістарычны часопіс», 2008.

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Электронныя сродкі навучання як кампанент вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі Беларусі ў старшых класах



*ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч — настаўнік гісторыі СШ №1 г. Пінска, саіскальнік кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы. Нарадзіўся ў 1963 г. у Пінску. У 1989 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ. Настаўнік вышэйшай катэгорыі. Даследуе праблемы ўкаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання.*

Прынятая пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 сакавіка 2007 г. № 265 праграма "Комплексная інфарматызацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гады" ў якасці асноўных задач вызначыла распрацоўку і ўкараненне нацыянальных інфармацыйных адукацыйных рэсурсаў, электронных сродкаў навучання, а таксама навуковага і вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсаў інфарматызацыі адукацыі[1]. Гэтыя задачы абумоўлены не толькі недастатковай тэарэтычна-метадычнай распрацаванасцю канцэптуальных асноў інфармацыйна-тэхналагічнага забеспячэння навучальнага працэсу, але і нізкай адаптаванасцю наяўных электронных сродкаў навучання да патрэб адукацыі. На дадзены момант дакладна не вызначаны метадычныя падыходы да спалучэння базавага і павышанага ўзроўняў навучання ў структуры ствараемых электронных вучэбных дапаможнікаў, а таксама пытанні, звязаныя з парадкам падрыхтоўкі электронных сродкаў навучання і працэдурай надання ім грыфа Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Праблема выкарыстання электронных сродкаў навучання ў працэсе вывучэння гісторыі разглядалася беларускімі даследчыкамі А.М.Балыкінай, М.І.Мініцкім, С.В.Пановым і Л.У.Стрыкелёвай, У.Н.Сідарцовым[2].

Спробы пераходу ад практычнага выкарыстання камп'ютэра да тэарэтычнага асэнсавання і навуковага абгрунтавання выкарыстання электронных сродкаў навучання на ўроку гісторыі зроблены ў публікацыях настаўнікаў-практыкаў В.У.Варкавец, А.С.Дзенісенкі, Т.М.Калтунчык, С.Я.Кудзінай, А.Д.Макеенкавай, Т.М.Сурконт, Н.С.Шаровай[3].

Разам з тым аналіз педагагічнай практыкі дазваляе сцвярджаць, што працэс распрацоўкі і выкарыстання электронных сродкаў навучання па гісторыі ў межах рэалізуемых інфармацыйных педагагічных тэхналогій на дадзены момант з'яўляецца ў пэўнай меры стыхійным. Існуючыя электронныя сродкі навучання маюць пераважна прэзентацыйны характар і арыентаваны на візуалізацыю навучання. Іх дыдактычныя магчымасці патрабуюць больш глыбокага тэарэтычнага і канкрэтна-прадметнага абгрунтавання зыходзячы са спецыфікі навучання гісторыі ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі.

Без разгорнутага аналізу дыдактычных і тэхналагічных магчымасцей электронных сродкаў навучання немагчыма тэарэтычная і практычная распрацоўка іх структуры і зместу, а таксама іх эфектыўнае выкарыстанне ў якасці аднаго з кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК) па гісторыі.

У навуковых даследаваннях, якія разглядаюць распрацоўку і прымяненне электронных сродкаў навучання (працы Т.С.Антонавай і А.Л.Харытонава, З.О.Джаліяшвілі, А.У.Кірылава, С.П.Крыцкага, М.Т.Студзенікіна, С.А.Хрыстачэўскага, Ю.Ю.Юмашавай[4]), існуюць розныя трактоўкі паняцця "электронны сродак навучання" (ЭСН) і розныя падыходы, у межах якіх разглядаецца спецыфіка выкарыстання ЭСН у дыдактычным працэсе.

Праграма "Комплексная інфарматызацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гады" вызначае паняцце "электронны сродак навучання" як "праграмна-метадычнае забеспячэнне для выкарыстання вучнямі ў навучальным працэсе па канкрэтнаму вучэбнаму прадмету на ўсіх этапах навучальнага працэсу"[5]. Выходзячы з такой трактоўкі да ЭСН па гісторыі Беларусі можна аднесці электронныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, гіпермедыясайты, камп'ютэрныя педагагічныя праграмныя сродкі з інфармацыйным напаўненнем, а таксама іншыя публікацыі педагагічнай накіраванасці, якія ствараюцца з дапамогай інфармацыйна-вылічальнай тэхнікі і размяшчаюцца на сродках тэлекамунікацый, магнітных, аптычных і іншых інфармацыйных носьбітах.

Выходзячы са спецыфікі выкладання гісторыі паняцце "электронны сродак навучання" патрабуе сваёй прадметнай канкрэтызацыі. У якасці характэрных прыкмет ЭСН па гісторыі вызначым наступныя:

• інструментальнасць (забеспячэнне фарміравання спосабаў дзейнасці і дасягнення дыдактычнай мэты);

• аўтаматызаванасць (здольнасць рэалізоўваць тэхналагічныя і дыдактычныя магчымасці ЭСН з дапамогай камп'ютэраў);

• алгарытмічнасць (здольнасць да паслядоўнага паэтапнага выканання лагічна ўзаемазвязаных аперацый у працэсе навучання гісторыі);

• інтэгратыўнасць (магчымасць выкарыстаць ЭСН у комплексе з традыцыйнымі сродкамі навучання гісторыі);

• інфармацыйнасць (здольнасць захоўваць, перапрацоўваць і перадаваць вялікія аб'ёмы фармалізаванай вучэбнай інфармацыі);

• дыдактычнасць (адлюстраванне мэт і задач навучання гісторыі і суадноснага прадметнага зместу, а таксама метадычных прынцыпаў і тэхналогіі навучання);

• кампенсаторнасць (здольнасць максімальна дасягнуць задач навучання з мінімальнымі затратамі вучэбнага часу);

• адаптыўнасць (здольнасць стварэння спрыяльных для старшакласнікаў умоў засваення зместу вучэбнага матэрыялу з дапамогай камп'ютэраў у комплексе з традыцыйнымі сродкамі навучання гісторыі).

Неабходна вызначыць тэхналагічныя і дыдактычныя якасці ЭСН, улік якіх дазволіць эфектыўна выкарыстоўваць гэты кампанент вучэбна-метадычнага комплексу ў дыдактычным працэсе.

Да тэхналагічных (апаратна-інструментальных) якасцей ЭСН можна аднесці атрактыўнасць (прываблівасць), інтэнсіўнасць і дынамічнасць уздзеяння; візуалізацыю інфармацыі і шматсэнсорнасць яе ўспрымання; магчымасць гіпертэкставай формы прадстаўлення інфармацыі; суадносенне вербальных і невербальных форм прадстаўлення інфармацыі, інтэрактыўнасць.

Да дыдактычных якасцей ЭСН адносім праграміраванасць навучання, падтрымку індывідуальнай і калектыўнай форм навучання, індывідуалізацыю навучання, павышэнне ў вучняў матывацыі да навучальна-пазнавальнай дзейнасці; магчымасць дасягнення большай эфектыўнасці ў засваенні ведаў, магчымасць правядзення маніторынгу. Гэтыя якасці ЭСН рэалізуюцца функцыянальна, што дазваляе канкрэтызаваць галіну прымянення ЭСН — гісторыя Беларусі. Да функцый, якія выконвае ЭСН для вучняў старшых класаў пры вывучэнні гісторыі Беларусі, належаць:

— кіраўнічая (ЭСН з'яўляецца дыдактычным і тэхналагічным інструментарыем, з дапамогай якога ажыццяўляецца эфектыўнае кіраванне працэсам засваення старшакласнікамі зместу матэрыялу па гісторыі);

— інфармацыйная (ЭСН з'яўляецца носьбітам і крыніцай гістарычнай інфармацыі, якая раскрывае ў даступнай для вучняў форме прадугледжаны адукацыйным стандартам змест);

— адукацыйная (забеспячэнне працэсу фарміравання ў вучняў старшых класаў сістэмных ведаў на праблемна-тэарэтычным узроўні);

— развіваючая (метадычны і тэхналагічны інструментарый ЭСН дазваляе фарміраваць уменні старшакласнікаў, неабходныя для прафесійнага самавызначэння і падрыхтоўкі да дзейнасці ў сучасных умовах);

— выхаваўчая (ЭСН дазваляе праз індывідуальную дзейнасць па засваенню зместу вучэбнага матэрыялу па гісторыі ўздзейнічаць на фарміраванне пэўных якасцей старшакласнікаў, што спрыяе іх сацыялізацыі);

— матывацыйная (ЭСН забяспечвае высокую матывацыю вучняў да навучальна-пазнавальнай дзейнасці пры вывучэнні гісторыі);

— каардынуючая (ЭСН з'яўляецца кампанентам вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі, які дазваляе каардынаваць прымяненне традыцыйных і электронных сродкаў навучання ў працэсе засваення вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу);

— інтэгруючая (ЭСН дазваляе ажыццяўляць інтэграцыю розных вучэбных прадметаў падчас прадстаўлення і ў працэсе засваення вучнямі вучэбнага матэрыялу);

— кантрольна-ацэньваючая (ЭСН прадугледжвае ажыццяўленне бягучага, прамежкавага, выніковага кантролю, ацэнку ўзроўню засваення ведаў і сфарміраванасці спецыфічных уменняў і навыкаў у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту);

— карэкціруючая (ЭСН дазваляе ажыццявіць карэкцыю працэсу засваення зместу і вынікаў навучання гісторыі);

— функцыя самаадукацыі (ЭСН дазваляе вучням самастойна засвойваць змест вучэбнага матэрыялу па гісторыі, а таксама распрацаваць індывідуальную траекторыю навучання).

Электронныя сродкі навучання па гісторыі Беларусі павінны ўяўляць адкрытую сістэму, якая дазваляе інтэгравацца з інфармацыйнымі і зместавымі часткамі іншых праграм, пабудаваных на аснове тэхналогіі мультымедыя, а таксама ўтрымліваць дапаўняючыя элементы (гістарычны даведнік (слоўнік), пошукавую сістэму і г.д.). У такім выпадку ЭСН мае тэхналагічную і дыдактычную пластычнасць у выкарыстанні і забяспечвае непарыўнасць і паўнату працэсу навучання. Гэта дазваляе ажыццявіць алгарытмізацыю навучальна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з дапамогай ЭСН, пазбегнуць жорстка вызначанай траекторыі навучання.

З'яўленне праграмных распрацовак па "Гісторыі Беларусі"[6] ў якасці электронных сродкаў навучання — прыклад асэнсаваных спроб стварэння эфектыўных інструментальных сродкаў актывізацыі навучальна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на CD-носьбітах.

Распрацоўку "Бакалаўр. Гісторыя Беларусі ад старажытнасці і да заканчэння XX стагоддзя" можна лічыць першай спробай стварэння навучальнай і кантрольна-ацэньваючай праграмы, якая ахоплівае ўвесь курс айчыннай гісторыі[7]. Мультымедыйны праект "Бакалаўр" быў створаны калектывам аўтараў з Пінска ў 1999 г. Перавагамі "Бакалаўра" з'яўляюцца атрактыўнасць і значная тэставая (больш за 6 500 тэставых заданняў) і інфармацыйная база (наратыўныя тэксты, ілюстрацыі, картаграфічны матэрыял), магчымасць карэкцыі дасягнутага вучнямі ўзроўню засваення ведаў, інтэрактыўнасць у працэсе трэнінгу і выніковага кантролю. Заданні ахопліваюць інфармацыйнае поле ўсяго прадметнага курса гісторыі Беларусі. Тэматычная структура курса дапоўнена блокамі "Помнікі гісторыі і культуры", "Гістарычныя персаналіі", "Геральдыка гарадоў Беларусі" (усяго 82 тэмы). Выкарыстаны закрытыя формы тэставых заданняў у іх варыятыўнасці. Прапануемы тып адказу для аналізу — выбарачны. Карыстальніку прапаноўваецца: а) выбраць адзіны правільны варыянт адказу з некалькіх прапануемых; б) выбраць некалькі правільных адказаў з многіх прапануемых.

Заданні выбіраюцца з базы даных пэўнага блока (блокаў). У рэжыме работы з канкрэтным заданнем-тэстам паслядоўнасць варыянтаў адказаў падаецца генератарам выпадковых лічбаў. У рэжыме экзамену 20 пытанняў. (Іх паслядоўнасць таксама падаецца з дапамогай генератара выпадковых лічбаў.) Выніковы бал (ад 0 да 10) карыстальнік атрымлівае ў адпаведнасці з паўнатой выканання прапануемых заданняў.

Гэты сродак змяншае спрошчаны інструментарый адлюстравання вынікаў навучання. Улік функцыянальных, дыдактычных і тэхналагічных аспектаў дазваляе дасягнуць не толькі засваення значнага аб'ёму факталагічнага матэрыялу, але і павялічыць матывацыю вучняў падчас яго выкарыстання.

Неабходна прыгадаць і спробу стварэння першага ў Рэспубліцы Беларусь комплекснага мультымедыйнага вучэбнага выдання "Гісторыя Беларусі старажытных часоў", якое дазваляе арганізаваць сістэмнае вывучэнне курса гісторыі Беларусі для вучняў 6-га класа. Праект ажыццявіў аўтарскі калектыў, які складаўся з супрацоўнікаў гістарычнага факультэта БДУ, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, настаўнікаў, а таксама праграмістаў і дызайнераў таварыства "Айліка". Гэты калектыў выйграў тэндэр, абвешчаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2005 г., на пастаўку праграмнага забеспячэння для сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі ў рамках выканання мерапрыемстваў рэспубліканскай праграмы "Інфарматызацыя сістэмы адукацыі"[8].

Змест электроннага сродку навучання "Гісторыя Беларусі старажытных часоў" у адрозненне ад друкаванага падручніка грунтуецца на праблемна-модульным прынцыпе. Тэмы ўяўляюць сабой адносна завершаныя модулі вучэбнай інфармацыі, кожны з якіх асвятляе адну з праблем гістарычнага развіцця першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Алгарытм засваення вучнямі зместу ЭСН вызначаны ў адпаведнасці з тэхналогіяй поўнага засваення ведаў: уводнае тэсціраванне па вывучанаму раней матэрыялу; знаёмства з факталагічным і тэарэтычным зместам новага вучэбнага матэрыялу з выкарыстаннем гіпертэкставых спасылак на паняцці і тэрміны; замацаванне матэрыялу праз выкананне крыжаванак і заданняў на веданне гістарычнай картаграфіі з выкарыстаннем картасхем, складанне інтэрактыўных тэставых мазаік-пазлаў з улікам узроставых асаблівасцей вучняў.

Агульная схема вывучэння тэмы можа быць прадстаўлена ў наступным выглядзе:




У структуры гэтага ЭСН вызначаны наступныя кампаненты: электронны падручнік (прадугледжвае прадстаўленне інфармацыі, замацаванне і кантроль ведаў вучняў з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарту); творчая майстэрня настаўніка (змяшчае матэрыялы, якія дазваляюць настаўніку канструяваць свой варыянт вучэбнага занятку з выкарыстаннем медыяпрэзентацыі, крыжаванак, тэстаў і электронных кніг); кантрольна-ацэньваючы механізм.

Важным з'яўляецца тое, што ў праекце відавочны пераход ад эмпірычнага падыходу ў распрацоўцы ЭСН да навуковага і метадычна абгрунтаванага.

Для рэалізацыі функцыі кантролю і ацэнкі вынікаў навучання настаўнікі гісторыі карыстаюцца кантрольна-вымяральнымі сістэмамі адукацыйных электронных выданняў і рэсурсаў. Яны не заўсёды маюць дыдактычна абгрунтаванае зместавае напаўненне і ў большасці сваёй не ўлічваюць алгарытмізацыі дзеянняў вучняў па засваенню чатырохкампанентнага зместу вучэбнага матэрыялу (педагагічна адаптаваны сацыяльны вопыт у складзе сістэмы ведаў, спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны)[9]. У якасці праграмных сродкаў, прызначаных для вымярэння вучэбных дасягненняў вучняў, часцей за ўсё выкарыстоўваюцца тэставы асяродак "Дзесяцібальны маніторынг"[10] і праграмна-метадычны комплекс "Знак"[11]. Выкарыстанне гэтых электронных сродкаў навучання заснавана на прымяненні тэставых методык з магчымасцю зместавага напаўнення тэстаў самім настаўнікам, што, безумоўна, прываблівае карыстальнікаў. Разам з тым у іх не ў поўнай меры вырашана праблема адаптацыі да ажыццяўлення рознаўзроўневага падыходу пры кантролі і ацэнцы вучэбнай дзейнасці вучняў у адпаведнасці з інтэгральнай дзесяцібальнай сістэмай адзнак і ўзроўнямі засваення зместу вучэбнага матэрыялу.

Праблемным аспектам выкарыстання большасці электронных сродкаў навучання з'яўляецца і няпоўная рэалізацыя прынцыпу пераемнасці паміж кантрольна-ацэньваючым інструментарыем, створаным з улікам крытэрыяльна-арыентаванага падыходу да тэсціравання, які выкарыстоўваецца для дыягностыкі паспяховасці выпускнікоў сярэдняй школы, і комплексам тэставых заданняў цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі, якія ствараюцца на аснове нарматыўна-арыентаванага падыходу. Гэты праблемны аспект можа быць зменшаны пры рэалізацыі крытэрыяльна-арыентаванага падыходу падчас распрацоўкі тэхналагічнай матрыцы для стварэння комплексу тэставых заданняў для вучняў старшых класаў і падрыхтоўкі да ўступнага экзамену па гісторыі Беларусі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Падобны падыход быў выкарыстаны пры распрацоўцы ЭСН "Гісторыя Беларусі. Тэматычныя тэсты"[12]. Стварэнне яго ажыццяўлялася:

— з улікам аптымізацыі кантрольна-ацэньваючай і карэкціруючай функцый пры ажыццяўленні карэляцыі ўзроўняў засваення навучальна-пазнавальнай дзейнасці з такімі формамі тэставых заданняў, якія максімальна спрашчаюць іх фармалізацыю і спрыяюць аўтаматызацыі працэсу педагагічнай дыягностыкі;

— з улікам вызначэння ў якасці крытэрыяльных паказчыкаў вучэбных дасягненняў старшакласнікаў ступені іх навучання суадносна з таксаноміяй узроўняў засваення па У.П.Сіманаву на розных этапах навучальна-пазнавальнай дзейнасці;

— праз прымяненне крытэрыяльна-арыентаванага падыходу да стварэння дыягнастычнага інструментарыя ў адпаведнасці з узроўнямі засваення чатырохкампанентнага зместу вучэбнага матэрыялу, якія забяспечваюць прадуктыўны ўзровень навучальна-пазнавальнай дзейнасці па фарміраванню спецыяльных гістарычных уменняў;

— праз рэалізацыю алгарытму, які прадугледжвае такія этапы, як заданне дыягнастычнасці ў дасягненні мэты навучання і ў выкананні патрабаванняў адукацыйнага стандарту і вучэбнай праграмы; канкрэтызацыя вынікаў навучання гісторыі

ў фармулёўках спосабаў дзейнасці, аптымізаваных у адпаведнасці з паказчыкам дзесяцібальнай шкалы ацэнак; стварэнне комплексу living рознаўзроўневых пытанняў і заданняў, арыентаваных на выяўленне якасці засваення зместу вучэбнага матэрыялу;

— праз выкарыстанне ў якасці інструментарыя ЭСН трэнінгавага рэжыму, які прадугледжвае магчымасць паўтору пасля няправільна выкананага задання, і рэжыму дапамогі, пры якім ажыццяўляецца доступ да неабходнай вучэбнай інфармацыі;

— выкарыстанне форм тэставых заданняў, арыентаваных на вызначэнне правільнай паслядоўнасці элементаў і ўсталяванне суадноснасці паміж імі, у якасці дыягнастычнага інструментарыя, які забяспечвае выяўленне прадуктыўнага ўзроўню вучэбнай дзейнасці вучняў.

Змястоўна ЭСН уключае наступныя тэмы (па два варыянты ў кожнай):

"Старажытнае грамадства";

"Узнікненне класавага грамадства і беларускай дзяржаўнасці (VI — сярэдзіна XIII ст.)";

"Беларусь у другой палове XIII—сярэдзіне XVI ст.";

"Беларусь у сярэдзіне XVI—XVIII ст.";

"Беларусь у складзе Расійскай імперыі";

"Беларусь у 1917 — 1939 гг.";

"БССР у гады Другой сусветнай вайны (1939—1945 гг.)";

"Беларусь у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе";

"БССР у сярэдзіне 50—сярэдзіне 80-х гг. XX ст.";

"Беларусь у сярэдзіне 80-х гг. XX ст.—пачатку XXI ст.".

Тэхнічнай перавагай праграмы з'яўляецца магчымасць яе загрузкі праз камп'ютэрную сетку. Праграмная абалонка дазваляе выкарыстоўваць яе кантралюючыя і навучальныя магчымасці. У рэжыме трэнінгу кожнае тэставае заданне змяшчае тлумачэнне, да якога карыстальнік можа звярнуцца пры ўзнікненні цяжкасцей падчас адказу. Праграма дазваляе звярнуцца да даведачнага матэрыялу па канкрэтнай тэме.

Выкананне тэставых заданняў па тым ці іншым тэматычным кірунку дае магчымасць на кожнай стадыі навучання і кантролю атрымліваць даныя пра ўзровень ведаў як асобнага вучня, так і групы ці класа і своечасова іх карэкціраваць.

Кожны варыянт той ці іншай тэмы складаецца з 52 тэставых заданняў. Заданні 1—28 з'яўляюцца заданнямі закрытага тыпу і патрабуюць выбару аднаго ці некалькіх варыянтаў адказаў з чатырох прапанаваных. У гэтай частцы змяшчаюцца і два заданні на выяўленне картаграфічных ведаў і ўменняў.

Заданні 29—34 на ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей прадугледжваюць правільнае суаднясенне элементаў двух няроўных мностваў. Заданні 35—40 патрабуюць правільнага вызначэння паслядоўнасці змешчаных элементаў. Заданні 41—50 уяўляюць сабой тэсты адкрытага тыпу. Афармленне адказаў на іх прадугледжвае напісанне (камп'ютэрны набор) назвы, прозвішча, даты, лічбы ці словазлучэння ў адпаведнасці з патрабаваннямі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў да запаўнення бланкаў адказаў на цэнтралізаваным тэсціраванні (без пропускаў і косак, двукосся, дужак і дэфісаў). Заданні 51—52 патрабуюць свабодна фармулюемага адказу ў пісьмовай ці вуснай форме, які павінен правярацца самім настаўнікам.

Структура тэста па складанасці вучэбнага матэрыялу вызначана ў адпаведнасці з узроўнямі засваення ведаў згодна з палажэннямі дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі.

Першы ўзровень — распазнаванне вучэбнага матэрыялу па асобных прыкметах.

Другі ўзровень — неасэнсаванае аднаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні памяці.

Трэці ўзровень — асэнсаванае аднаўленне вучэбнага матэрыялу.

Чацвёрты ўзровень — выкарыстанне ведаў у знаёмай (стандартнай) сітуацыі па ўзору.

Пяты ўзровень — выкарыстанне ведаў у незнаёмай (нестандартнай) сітуацыі на творчым узроўні.

Заданні 1—40 адпавядаюць першаму—трэцяму ўзроўням засваення. Яны прадугледжваюць дакладнае веданне фактaлагічнага, храналагічнага, картаграфічнага матэрыялу, а таксама выкарыстанне ўменняў вызначаць прычынна-выніковыя сувязі, сістэматызаваць і абагульняць фактaлагічны матэрыял. Заданні 41—50 адпавядаюць чацвёртаму ўзроўню засваення, які прадугледжвае ўменне сістэматызаваць і абагульняць фактaлагічны і тэарэтычны матэрыял на больш высокім узроўні. Праверка пятага ўзроўню засваення адбываецца праз выкананне вучнем заданняў 51, 52, якія прадугледжваюць афармленне адказу ў якасці свабодна фармулюемага.

Выкананне тэставых заданняў абмежавана па часе (на выкананне аднаго варыянта тэсціравання адводзіцца 80 хвілін). Падчас выканання кантрольнага тэста карыстальнік не мае магчымасці даведацца пра правільнасць адказаў. Толькі пасля завяршэння тэсціравання ён атрымлівае інфармацыю пра колькасць правільных адказаў, колькасць набраных балаў, пра выніковую адзнаку. Бягучыя і выніковыя статыстычныя даныя падаюцца ў даступнай форме: лічбавай, таблічнай, графічнай, дыяграмнай.

Пры правядзенні кантролю інструментальнымі сродкамі гэтага ЭСН правяраецца ўзровень як тэарэтычных, так і фактaлагічных, храналагічных, картаграфічных ведаў, а таксама агульнавучэбныя і спецыяльныя ўменні старшакласнікаў. Гэта дазваляе ажыццявіць пакрокавы кантроль за засва-

еннем ведаў. Выкананне праграмных заданняў дзякуючы статыстычным даным дае магчымасць на кожнай стадыі навучання атрымліваць інфармацыю пра ўзровень ведаў навучаемага. На ўзроўні самаадукацыі праграма дазваляе вучню самастойна знаходзіць прабелы ў сваіх ведах і ліквідаваць іх, што якасна змяняе саму канкрэтна-асобасную матывацыю як да вывучэння гісторыі Беларусі, так і да працэсу навучання ўвогуле. Тым самым ЭСН садзейнічае пераходу да новай парадыгмы адукацыі — эфектыўнага навучання — з мэтай забяспечыць не толькі неабходную інфармаванасць навучаемага ў канкрэтнай галіне ведаў, але і фарміраванне эфектыўнай матывацыі да яе пастаяннага абнаўлення і пашырэння як у вучнёўскай, так і ў студэнцкай аўдыторыі, у будучай прафесійнай дзейнасці любога спецыяліста.

Відавочна, што выкарыстанне спецыфічных асаблівасцей ЭСН па гісторыі Беларусі змяняе існуючае разуменне сучаснага вучэбнага працэсу, яго структуру і выконваемыя дыдактычныя функцыі. Вырашэнне праблемы інтэграцыі электронных сродкаў навучання ў склад вучэбна-метадычнага комплексу па гісторыі Беларусі, іх арганічнага ўключэння ў дыдактычны працэс павінна адбывацца праз атрыманне новых дыдактычных магчымасцей і дасягненне зададзенага ўзроўню навучання. Эфектыўнасць комплекснасці ўжывання ўсіх кампанентаў ВМК (у тым ліку і ЭСН) залежыць ад таго, якія дыдактычныя мэты вызначыць настаўнік, якім чынам будзе размешчаны вучэбны матэрыял, як і калі будуць выкарыстоўвацца электронныя сродкі навучання, якім чынам будзе пабудавана і рэалізавана сама логіка выкарыстання інфармацыйнай педагагічнай тэхналогіі.

Такім чынам, канкрэтызуючы змест паняцця "электронны сродак навучання", вызначым яго ў якасці афармленага ў электронным выглядзе сродку навучання, прызначанага для аўтаматызацыі кіравання навучальна-пазнавальнай дзейнасцю вучняў на ўсіх этапах дыдактычнага працэсу пры вывучэнні гісторыі. ЭСН па гісторыі Беларусі з'яўляецца адной з частак прадметнага вучэбна-метадычнага комплексу.

Улік і выкарыстанне спецыфічных дыдактычных і тэхналагічных асаблівасцей электронных сродкаў навучання па гісторыі Беларусі дазволяць стымуляваць пазнавальны інтарэс і павысіць эфектыўнасць навучання ў вучняў старшых класаў, а таксама рэалізаваць механізм алгарытмізацыі дзеянняў вучняў пры засваенні зместу вучэбнага матэрыялу, забяспечыць прадуктыўны ўзровень засваення ведаў і уменняў.

Комплекснае выкарыстанне электронных і традыцыйных кампанентаў ВМК па гісторыі Беларусі забяспечвае эфектыўнае кіраванне навучальна-пазнавальнай дзейнасцю вучняў і звязваецца са здольнасцю настаўніка актывізаваць мысленне вучняў, надаць навучанню праблемна-пошуковы і даследчы характар у адпаведнасці са спецыфікай выкладання гісторыі ў старшых класах.

Навучанне гісторыі Беларусі з комплексным выкарыстаннем ЭСН і традыцыйных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу можа стаць эфектыўным сродкам грунтоўнага і якаснага засваення вучнямі старшых класаў зместу навучальнага матэрыялу з улікам спецыфікі школьнай гістарычнай адукацыі і магчымасцей камп'ютэра.

---

[1] Комплексная информатизация системы образования Республики Беларусь на 2007—2010 годы: Постановление Совета Министров Республики Беларусь, 01 марта 2007 г. № 265 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. 2007, № 67. 5/24853.

[2] Балыкина Е.Н. Компьютерные технологии обучения. Истоки и развитие информатизации образования // Гісторыя: праблемы выкладання. 1999, № 1. С. 49—63; Миницкий Н.И. Методы построения научного и образовательного исторического знания. Мн., 2006; Паноў С.В., Стрыкелёва Л.У. Структурна-лагічныя схемы як аснова рэалізацыі камп'ютэрных тэхналогій // Гісторыя: праблемы выкладання. 1997, №1. С. 51—57; Панов С.В. Научно-методические аспекты компьютерного обучения в общеобразовательной школе // Теоретико-методологические проблемы исторического познания: Материалы к международной научной конференции: В 2 т. / Под ред. В.Н.Сидорцова, В.С.Кошелева, Я.С.Яскевич. Т. 2. Мн., 2000. С. 310—315; Сідарцоў У.Н., Балыкіна А.М. На шляху да камп'ютэрызацыі // Беларускі гістарычны часопіс. 1993, № 1. С. 111—113.

[3] Варковец О., Зинковская Е. Общая характеристика технологии «Школьная историческая информатика» // Гісторыя: праблемы выкладання. 2001, № 4. С. 48—54; Варковец О.В. Возможности и перспективы компьютеризированного преподавания в школе // Информационное обеспечение исторического образования: Сб. ст. / Под ред. В.Н.Сидорцова, А.Н.Нечухрина, Е.Н.Балыкиной. Мн., 2003. С. 145—147; Денисенко А. Использование информационных технологий на уроках истории и во внеклассной работе // Гісторыя: праблемы выкладання. 2006, № 3. С. 33—34; Калтунчык Т.М., Жаландзеўская С.П. Беларусь у XVI—першай палове XVII ст. (Аперацыі на камп'ютэры з фрагментамі тэксту) // Беларускі гістарычны часопіс. 2007, № 12. С. 56—60; Кудзіна С. Камп'ютэр на ўроках гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2005, № 10. С. 65—65; Макеенкава А.Д. Інфармацыйныя тэхналогіі на ўроках гісторыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2007, № 11. С. 65—69; Сурконт Т.М. Информационные технологии в преподавании истории // Гісторыя: праблемы выкладання. 2008, № 2. С. 22—25; Шарова Н. Использование новых информационных технологий на уроках истории // Гісторыя: праблемы выкладання. 2006, № 1. С. 33—34; Шарова Н. Традыцыйная культура беларусаў у XIV—XVIII стст. X (XI') клас // Беларускі гістарычны часопіс. 2007, № 8. С. 64—71.

[4] Антонова Т.С. Концепция мультимедийного учебника истории // Опыт компьютеризации исторического образования в странах СНГ: Сб. ст. / Под ред. В.Н.Си-

дорцова, Е.Н.Балыкиной. Мн., 1999; Джалиашвили З.О. Компьютерное сопровождение учебника по истории // ИБ АИК. № 23. Март 1998 г. М., 1998. С. 210—211; Кириллов А.В. Новые информационные технологии в базовом гуманитарном образовании // Информатизация базового гуманитарного образования в высшей школе: Межвузовская научно-методическая конференция: Тезисы докладов / Под ред. Ю.П.Смирнова. М., 1995. С. 18—20; Крицкий С.П. Создание обучающих гипермедиа-программ // Педагогические аспекты исторической информатики. Вып. 1. Опыт компьютеризации исторического образования в странах СНГ / Под ред. В.Н.Сидорцова, Е.Н.Балыкиной. Мн., 1999. С. 174—184; Студеникин М.Т. Современные технологии преподавания истории в школе: Пособие для учителей и студентов вузов. М., 2007; Христочевский С.А. Электронные мультимедийные учебники и энциклопедии // Информатика и образование. 2000, № 2. С. 70—78; Ён жа. Электронный учебник — текущее состояние // Компьютерные инструменты в образовании. 2001, № 6. С. 3—10; Юмашева Ю.Ю. Разбудим ли чужую мысль? (Педагогические аспекты исторической информатики на конференции в Минске) // ИБ АИК. № 28. М., 2001. С. 41—43.

[5] Комплексная информатизация системы образования Республики Беларусь на 2007—2010 годы: Постановление Совета Министров Республики Беларусь, 01 марта 2007 г. № 265.

[6] Балыкина Е.Н. Первый государственный электронный учебник по истории Беларуси для средней школы: разработка и апробация // XVI Международная конференция-выставка «Информационные технологии в образовании: ИТО-2006»: Сборник трудов участников конференции / Под ред. Б.Г.Киселева. М., 2006. С. 71—74; Бакалаўр. Гісторыя Беларусі ад старажытнасці і да пачатку XXI ст.: Тэматычныя тэсты [Электронны рэсурс]. Пінск, 2000. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM); Гісторыя Беларусі: Тэматычныя тэсты [Электронны рэсурс]. Мн., 2007. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

[7] Бакалаўр. Гісторыя Беларусі ад старажытнасці і да пачатку XXI ст.: Тэматычныя тэсты [Электронны рэсурс]. Пінск, 2000. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

[8] Балыкина Е.Н. Первый государственный электронный учебник по истории Беларуси для средней школы: разработка и апробация // XVI Международная конференция-выставка «Информационные технологии в образовании: ИТО-2006»: Сборник трудов участников конференции. С. 71—74.

[9] Информационные технологии в преподавании предметов истории и ЧОГ: Материалы к республиканскому семинару «Информационная культура специалиста в условиях информатизации системы образования» [Электронный ресурс]. Мн., 2007. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

[10] Гращенко П.Л., Сергеев С.И., Карако Т.В. Компьютерные технологии организации образовательного мониторинга на внутришкольном уровне // Информатизация образования. 2005, № 4. С. 40—44.

[11] Программно-методический комплекс «Знак» [Электронный ресурс]. Мн., 2004. 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

[12] Гісторыя Беларусі: Тэматычныя тэсты [Электронны рэсурс].